*Філіпаў, А. А.* Брахманская канцэпцыя арганізацыі дзяржавы і праблема яе адпаведнасці ў менталітэце старажытнаіндыйскага насельніцтва (на прыкладзе Законаў Ману, I ст. да н. э. – I ст. н. э.) / А. А. Філіпаў // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 26-29.

***А. А. Філіпаў***

# БРАХМАНСКАЯ КАНЦЭПЦЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАБЛЕМА ЯЕ АДПАВЕДНАСЦІ Ў МЕНТАЛІТЭЦЕ СТАРАЖЫТНАІНДЫЙСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЗАКОНАЎ МАНУ, I СТ. ДА Н. Э. – I СТ. Н. Э.)

Нягледзячы на доўгую гісторыю вывучэння Дхармашастры Ману шэраг важных пытанняў з-за пэўных прычын засталіся амаль па-за ўвагай даследчыкаў. Гэта тычыцца і праблемы адпаведнасці канцэпцыі дзяржавы Законаў Ману (далей — ЗМ) менталітэту старажытнаіндыйскага насельніцтва. Мы прапануем



наступную схему аналізу: 1) вызначыць дзяржаўную канцэпцыю, адлюстраваную ў ЗМ; 2) вызначыць магчымы механізм работы гэтай схемы і яе вонкавыя праявы; 3) параўнаць атрыманыя вынікі з тым фактычным матэрыялам, які маем з гісторыі Старажытнай Індыі.

Галоўным прадметам ЗМ з'яўляецца дхарма, якая на падставе тэксту вызначаецца як сукупнасць норм, што вызначаюць правілы жыцця чалавека ў залежнасці ад яго сацыяльнага становішча. Дхарма лічылася свяшчэннай і на касмічным узроўні захоўвала Сусвет (Упарадкаванае). Для лепшага разумення гэтай тэзы трэба ўзгадаць, што яшчэ ў Рыгведзе зафіксавана развітае вучэнне аб рыце — тым, што арганізуе і трымае ўвесь Сусвет. Усе аб'екты Сусвету падпадалі пад яе ўздзеянне і вызначаліся ёю. Але сувязь «рыта — свет» была ўзаемнай, г. зн. свет (і перш за ўсе чалавек) сваімі ўчынкамі мог аказаць уздзеянне на рыту, а праз яе і на Сусвет, прычым гэты ўплыў мог быць і дэструктыўным. Вышэйшай крыніцай дхармы абвяшчаўся Брахман, які на аснове складанай метафізікі перадае веданне дхармы толькі брахманам, якія перадаюць яго іншым людзям.

Такім чынам, за брахманамі замацоўвалася важнейшая сацыяльныя і касмічная функцыя перадачы дхармы, у якую ўваходзілі і нормы права, што на ўзроўні дзяржавы азначала фактычнае замацаванне за апошнімі заканадаўчай улады. Што тычыцца дхармы кшатрыяў, то на першае месца выводзіцца функцыя аховы падданых, пад якой разумелася перш за ўсё пакаранне парушаючых дхарму і, такім чынам, прадухіленне дэструктыўнага ўздзеяння на Сусвет. Ніякіх парушэнняў дхармы не дазвалялася. Такім чынам, артадаксальная тэорыя арганізацыі свету і размеркавання ў ім функцый цара і брахманаў можа быць прадстаўлена наступным чынам: 1) існуе жорсткая ўзаемасувязь «рыта — свет», адным з увасабленняў якой з'яўляецца існаванне асобай дхармы ў кожнай сацыяльнай групе; 2) сумяшчэнне дхарм не дапускаецца; 3) адзіная крыніца дхармы ў Сусвеце — Брахман, а на зямным узроўні — Прахманы.

Дадзеная схема прадугледжвае наступнае: 1) заканадаўчая ўлада поўнасцю пераходзіць пад кантроль варны брахманаў, цар пазбаўляецца ўсялякай заканадаўчай

ініцыятывы; 2) у дзяржаве ствараецца другі апарат кіравання, які складаецца з брахманаў (гэта прадугледжвае неэфектыўнасць царскага кіравання); 3) таму што кожны Сірахман абвяшчаецца своеасаблівым рэтранслятарам зыходзячага ад Брахмана ведання дхармы, адбываецца працэс распылення заканадаўчай улады паміж усімі прадстаўнікамі варны брахманаў.



Гэта прадугледжвае па сутнасці развал намінальна адзінай дзяржавы на пэўную колькасць дробных тэрыторый, адзінства якіх будзе забяспечвацца не органамі свецкай улады, якія фарміруюцца з прадстаўнікоў варны кшатрыяў, а групаваннем насельніцтва вакол аўтарытэтнага на дадзенай тэрыторыі брахмана. Прычым трэба зазначыць, што тэрытарыяльныя адзінкі будуць найдрабнейшымі. Кшатрыйскі апарат кіравання мясцовага ўзроўню будзе мінімальным ці ўвогуле адсутнічаць. Кантроль з боку цара будзе вельмі неэфектыўным.

Паводле ЗМ VII.70, 75, 76 вышэйшая дзяржаўная ўлада складалася з цара і 7—8 саветнікаў (saciva), з якіх як мінімум адзін быў брахманам, названым «найвыдатнейшым», што фактычна дае (ці не дае) санкцыю царскім распараджэнням, адсочвае іх адпаведнасць ці неадпаведнасць дхарме. Можна меркаваць, што сярод брахманаў існавала пэўная іерархія, крытэрыем якой з'яўлялася вучонасць, што азначала большую ці меншую дасведчанасць у пытаннях дхармы і здольнасць атрымоўваць веды ад Брахмана. Найразумнейшы брахман займае пасаду галоўнага саветніка пры цары, а менш разумныя, па-бачнаму, будуць займаць пасады саветнікаў пры кіраўніках адміністрацыйных адзінак дзяржавы. Дадзеная сістэма неабходна, інакш распараджэнні мясцовай адміністрацыі без санкцыі брахманаў не будуць мець для мясцовага насельніцтва ніякага значэння. Такім чынам, брахманы бяруць пад свой кантроль усю вертыкаль улады.

Гэта сістэма быццам бы магла б забяспечыць адзінства дзяржавы, але, як адзначалася, крытэрыем брахманскай іерархіі была вучонасць. Безумоўна, гэта болып чым суб'ектыўны крытэрый, і можна меркаваць, што рэальная вартасць брахмана вызначалася яго аўтарытэтнасцю і павагай, якой ён карыстаўся сярод мясцовага насельніцтва. ЗМ дазваляюць выдзеліць 2 асноўныя падыходы да вызначэння разумнасці брахмана: 1) лініджавая сістэма, іерархія ўнутры якой залежыць звычайна ад старшынства і дзе ўсе сацыяльныя ролі адпавядаюць месцу асобы ў сістэме родавых сувязей; 2) сістэма, іерархія ўнутры якой залежыць выключна ад асабістых якасцей брахмана і болып ні ад чаго іншага. Менавіта на гэту сістэму арыентаваліся асноўныя пласты грамадства.

Такім чынам, насельніцтва кожнай мясцовасці (можна меркаваць, што базавай адзінкай у гэтым выпадку выступала вёска) больш-менш самастойна вызначала аўтарытэтных для сябе брахманаў. Прычым адной з найважнейшых прыкмет дабрачыннасці, а значыць і разумнасці брахмана, была яго аскетычнасць. Безумоўна,



брахманы, якія жылі пры царскім палацы, мала паходзілі на сапраўдных аскетаў, якія ідуць па шляху зліцця з Брахманам. Такім чынам, цэнтры заканадаўчай улады па сутнасці пераходзілі з адміністрацыйных цэнтраў, дзе побач з кшатрыйскай адміністрацыяй былі засяроджаны і брахманы, у месцы пражывання пустэльнікаў, што пры ўмове існавання абшчыны ў Індыі азначала фактычны развал намінальна адзінай

дзяржавы на найдрабнейшыл тэрытарыяльныя адзінкі, якія былі аб’яднаны намінальнай уладай адзінага цпра.

Дадзеныя высновы добра суадносяцца з рэаліямі палітычнага жыцця Індыі, асаблівасцямі якога былі: няўстойлівасць буйных дзяржаўных утварэнняў, з аднаго боку, але надзвычайная ўстойлівасць дробных структурных адзінак, надзвычайна вялікі ўплыў брахманаў пры адсутнасці нейкай іх афармленай арганізацыі, стойкасць пры сутыкненні з іншымі сістэмамі разумення свету.

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што брахманская канцэпцыя дзяржавы адпавядала менталітэту індыйскага насельніцтва, што і абумовіла так званую «стабільнасць беспарадку», характэрную для індыйскай палітычнай сістэмы. Усе спробы змяніць сістэму арганізацыі дзяржавы на мясцовай глебе аказаліся безвыніковымі. Пры ўмове, што брахманы не валодалі рэальнай сілай, акрамя падтрымкі насельніцтва, нашы вывады можна лічыць абгрунтаванымі.